Д4

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ

УДК 021: 658.01

На правах рукапісу

РАКАВЕЦКАЯ Людміла Іванаўна

# ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДЫЧНЫЯ АСНОВЫ БІБЛІЯТЭЧНАГА МЕНЕДЖМЕНТУ

05.25.03 – бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства

АЎТАРЭФЕРАТ

дысертацыі на суісканне навуковай ступені кандыдата педагагічных навук

Мінск 1997

Работа выканана на кафедры бібліятэказнаўства Беларускага універсітэта культуры

Навуковы кіраўнік -- кандыдат педагагічных навук, прафесар Дзямешка Л.А.

Афіцыйныя апаненты -- доктар педагагічных навук, прафесар Карташоў М.С. кандыдат педагагічных навук, дацэнт Касап В.А.

Вядучая арганізацыя -- Беларускі інстытут праблем культуры

Абарона адбудзецца 26.12.97г. у 10^00 гадзін на пасяджэнні савета К 09.03.01 па абароне дысертацый на суіскание вучонай ступені кандыдата навук у Беларускім універсітэце культуры па адрасу: 220001, г.Мінск, вул. Рабкораўская, 17.

З дысертацыяй можна азнаеміцца ў бібліятэцы Беларускага універсітэта культуры

Аўтарэферат разасланы "21" лістапада 1997 г.

Вучоны сакратар савета кандыдат педагагічных навук, дацэнт Л.І.Казлоўская

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

Актуальнасць даследавання праблем і тэндэнцый развіцця бібліятэчнага менеджменту ў Рэспубліцы Беларусь у тэарэтыка-метадычных, педагагічных і сацыяльна-псіхалагічных аспектах дыктуецца неабходнасцю распрацоўкі канцэптуальнай тэарэтычнай асновы, методыкі яе ўкаранення і ўдасканалення з улікам менталітэту і сацыяльна-культурных умоў.

Бібліятэчная дзейнасць у кожнай краіне мае свае асаблівасці, але стварэнне міжнародных сістэм інфармацыі, іншых структур інтэгрыруючай уласцівасці прывяло да калектыўнага асэнсавання новых рэальнасцей.

Развіццё бібліятэчнай навукі і практыкі павінна быць звязана з працэсам вывучэння сусветнага вопыту і выкарыстаннем яго каштоўнасцей у сацыяльна-эканамічнай сітуацыі Беларусі.

Адной з навацый замежнага бібліятэчнага вопыту з'яўляецца менеджмент як упраўленне інтэлектуальнымі, арганізацыйнымі і тэхналагічнымі рэсурсамі ў мэтах найбольш эфектыўнай работы. Вывучэнне гэтага вопыту асабліва важна для краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (да іх адносіцца і Беларусь), дзе прыступілі да стварэння новай сістэмы ўпраўлення бібліятэкай, у якой менеджмент з'яўляецца базавым звяном.

Але замежны вопыт, якім бы прагрэсіўным ён ні быў, можа стаць толькі асновай і ключом для стварэння айчынных тэарэтычных і метадычных распрацовак. Адаптацыя тэорыі менеджменту да практыкі работы бібліятэк Беларусі дапаможа фарміраванню ў бібліятэкараў нашай дзяржавы новага прафесійнага ўсведамлення і навыкаў узаемадзеяння. З мэтай рэалізацыі новай канцэпцыі ўпраўлення на практыцы ім неабходна дапамагчы усвядоміць сваё месца ў новай рэчаіснасці, авалодаць метадалогіяй і методыкай менеджменту, што дасць магчымасць найлепшым чынам распараджацца оваімі ведамі, уменнем, а таксама часам.

Зыходзячы з вышэй адзначанага і выбрана тэма дысертацыі, дзе зроблена спроба лабудаваць структуру сістэмы ўпраўлення бібліятэкай, даследаваць арганізацыйныя, эканамічныя і сацыяльна-псіхалагічныя аспекты менеджменту.

Асновай для вывучэння гэтай тэмы паслужыла праблемная сітуацыя, якая склалася ў рэспубліцы ў сувязі з пераходам бібліятэк да новых умоў гаспадарання. Яна выявіла недахопы і супярэчнасці тэарэтычнага, метадычнага і практычнага характару, звязанныя са спробамі захаваць у новых умовах старыя метады работы. Нізкая эфектыўнасць традыцыйных форм выклікала неабходнасць прымянення ў іх рабоце менеджменту.

Беларускі ... культуры
Ін...

Распрацаванасць тэмы. Праблемная сітуацыя заключаецца ў тым, што назапашаны вопыт прымянення ў бібліятэках менеджменту слаба вывучаны, фрагментарны і неўпарадкаваны. Дастаткова адзначыць, што ў комплекснай пастаноўцы праблема бібліятэчнага менеджменту да гэтага часу не вывучалася. Асобныя аспекты мадэрнізацыі сістэмы ўпраўлення бібліятэкай знайшлі сваё адлюстраванне ў публікацыях бібліятэказнаўцаў краін СНД: Ю.А.Грыханава, Т.Ф.Каратыгінай, Н.В.Магілевер, А.В.Сакалова, І.А.Сталярова, Н.І.Цюлінай, работы якіх сведчаць аб актуальнасці тэмы, але асвятляюць толькі пачатковы этап распрацоўкі праблемы.

Вынікі даследавання бібліятэчнага менеджменту, што праводзіліся Е.Б.Арцем'евай, І.К.Джэралісўскай, В.Б.Чурбанавым, падчас зводзяцца да спроб механічнага пераносу асноўных палажэнняў менеджменту замежжа на айчынную глебу. Пры гэтым рэдка даецца аналіз "вузкіх месц" упраўленчай дзейнасці бібліятэк і вызначаюцца перспектывы, тэндэнцыі, канкрэтныя прапановы па вырашэнню ўзнікшых праблем.

Вялікую ролю ў развіцці бібліятэчна-інфармацыйнага менеджменту і маркетынгу адыгралі работы С.Д.Бадрунова, Л.Н.Герасімавай, В.А.Крышкевіча, С.Г.Матлінай, а таксама беларускіх бібліятэказнаўцаў — Л.А.Дзямешка, Р.С.Матульскага, С.А.Паўлавай, М.А.Яцэвіча.

Аналіз праведзеных тэарэтычных распрацовак разам з тым дае нам магчымасць канстатаваць, што праблемы бібліятэчнага менеджменту ў рэспубліцы з улікам канкрэтнай сацыяльна-эканамічнай сітуацыі не знайшлі яшчэ адпаведнага адлюстравання. Даследаванняў жа па арганізацыі і ўдасканаленню ўпраўленчай дзейнасці бібліятэк увогуле практычна не існуе. Таму дысертацыйная работа з'ўляецца першым комплексным даследаваннем праблем бібліятэчнага менеджменту, якое праведзена на стыку эканамічнага і змястоўнага аспектаў. Гэта дае магчымасць раскрыць механізм упраўлення бібліятэкай у новых сацыяльна-эканамічных умовах.

Сувязь работы з навуковымі праграмамі, тэмамі. Дысертацыя звязана з навуковай тэмай кафедры бібліятэказнаўства Беларускага універсітэта культуры "Гісторыя і сучасны стан бібліятэчнай справы ў Беларусі".

Аб'ектам дадзенага даследавання з'ўляецца бібліятэчны менеджмент.

Прадмет даследавання склалі тэарэтыка-метадычныя праблемы фарміравання і функцыяніравання бібліятэчнага менеджменту ва ўмовах Рэспублікі Беларусь.



Мэты і задачы даследавання.

Асноўнай мэтай даследавання стала распрацоўка і абгрунтаванне тэарэтычнай асновы канцэпцыі бібліятэчнага менеджменту, выяўленне заканамернасцей яго развіцця. Для дасягнення гэтай мэты былі пастаўлены наступныя задачы:

1. Даследаваць асноўныя тэндэнцыі развіцця бібліятэчнага менеджменту.

2. Абгрунтаваць сутнасныя характарыстыкі бібліятэчнага менеджменту — прынцыпы, метады, функцыі.

3. Выявіць асаблівасці і накірункі бібліятэчнага менеджменту, якія ўплываюць на механізм упраўлення бібліятэкай.

4. Распрацаваць методыкі укаранення бібліятэчнага менеджменту ў практыку работы бібліятэк Рэспублікі Беларусь.

5. Разгледзець сучасны стан і накірункі ўдасканалення бібліятэчнага менеджменту ў Беларусі.

Гіпотэзай даследавання з'ўляецца палажэнне аб тым, што ўдасканаленне працэсу ўпраўлення бібліятэчнай справай у новай сацыяльна-эканамічнай сітуацыі адбудзецца пры ўмове ўкаранення менеджменту як сучаснай канцэпцыі ўпраўлення інтэлектуальнымі, арганізацыйнымі і тэхналагічнымі бібліятэчнымі рэсурсамі ў Рэспубліцы Беларусь.

Метадалагічнай асновай даследавання з'явіліся работы па пытаннях менеджменту і маркетынгу, вядомыя як універсальныя ў сферы гэтых галін пазнання. У аснову распрацоўкі навуковай канцэпцыі даследавання пакладзены фундаментальныя палажэнні замежных і айчынных тэарэтыкаў менеджменту: Ф.Тэйлара, А.Файоля, Л.Урвіка, Б.Барроўза, М.Х.Мескона, А.В.Папова, І.Н.Герчыкавай і інш., ідэі канцэпцыі маркетынгу: Ф.Котлера, Е.Дзіхтля, Х.Хершгена, Д.А.Йорка, П.Борхарда. Выкарыстоўваліся работы расійскіх бібліятэказнаўцаў і менеджэраў: С.Д.Калегаевай, А.Н.Ванеева, В.К.Клюева, М.Я.Дворкінай, Е.Н.Ястрабавай; працы беларускіх вучоных — У.А.Акуліча, Н.У.Клімянковай, М.І.Базылёва, І.І.Куліка, П.В.Лешчылоўскага, М.І.Кабушкіна, А.Е.Дубовіка і інш.

Агульная метадалогія даследавання базіруецца на вучэнні аб структуры, лагічнай арганізацыі, метадах і сродках дзейнасці бібліятэкі як цэласнай сістэмы.

На ўзроўні канкрэтна-навуковай метадалогіі ў якасці асноўнага арсеналу былі узяты прынцып сістэмнасці, які прадугледжвае функцыянальна-мэтавы і сістэмна-структурны аналіз. Даследаванне таксама грунтавалася на кумулятыўным падыходзе, які дазваляе аб'яднаць веды ў галіне бібліятэчнага менеджменту і выявіць пераемнасць навуковай творчасці.

Для вырашэння даследчых задач быў выкарыстаны комплекс метадаў: вывучэнне і абагульненне тэорыі і практыкі бібліятэчнага менеджменту, тэарэтычнае мадэліраванне вывучаемых працэсаў, прагназіраванне, кантэнт-аналіз, а таксама параўнаўча-гістарычны, рэтраспектыўны, параўнаўча-сапастаўляльны аналіз.

У працэсе даследавання вывучаны і прааналізаваны работы айчынных і замежных бібліятэказнаўцаў,вядучых спецыялістаў Еўропы і ЗША па пытаннях гісторыі, тэорыі, методыкі і арганізацыі менеджменту, а таксама матэрыялы міжнародных арганізацый ( ЮНЕСКА, ІФЛА,ІСО), звязаных з пытаннямі менеджменту, і заканадаўчыя дакументы Рэспублікі Беларусь. У дысертацыі выкарыстаны крыніцы на беларускай, рускай, польскай, нямецкай і англійскай мовах.

Навуковая навізна атрыманых вынікаў заключаецца ў тым, што ў дысертацыі:

— упершыню тэарэтычна абгрунтавана трохузроўневая сістэма управлення бібліятэкай: вышэйшы ўзровень (дырэкцыя бібліятэкі), сярэдні (загадчыкі аддзелаў і філіялаў), асноўны -- аперацыйны менеджмент (кіраўнікі груп, сектараў, галоўныя спецыялісты). Кожнаму з гэтых узроўняў управлення вызначаны адпаведны састаў функцый, правоў і абавязкаў;

— прапанавана навуковае вызначэнне тэрмінаў "бібліятэчны менеджмент", "бібліятэчны маркетынг", "маркетынгавы менеджмент", абгрунтаваны іх аб'ём і змест;

— на падставе існуючых навуковых тэорый дадзена класіфікацыя прынцыпаў бібліятэчнага менеджменту, якія падзяляюцца на тры групы: структурна-функцыянальныя, прынцыпы управлення людзьмі і прынцыпы, фарміруючыя асобу менеджэра, а таксама комплексу метадаў управлення: даследчыя, эканамічныя, арганізацыйна-распарадчыя, сацыяльна-псіхалагічныя;

— сфарміравана функцыянальная структура управлення бібліятэкай у новых умовах, раскрыты яе сутнасныя характарыстыкі, устаноўлена паслядоўнасць рэалізацыі і ўзаемасувязь функцый управлення;

— даследаваны ўплыў сацыяльна-псіхалагічных аспектаў на ўпраўленне бібліятэкай і зроблена выснова, што ў сучасных умовах істотна змянілася матывацыя ўпраўлення: пераважнае значэнне набылі сацыяльна-псіхалагічныя метады ўпраўлення над адміністрацыйнымі;

— навукова распрацаваны падыходы да рэалізацыі канцэпцыі бібліятэчнага маркетынгу, сутнасць якой вызначае прыярытэтнасць патрэб карыстальнікаў і неабходнасць прыстасавання бібліятэчнай вытворчасці да гэтых патрэб;



-- абгрунтавана класіфікацыя бібліятэк, заснаваная на асабістых і грамадска-значных матывацыях звароту чытача ў бібліятэку , што з'яўляецца галоўнай прыкметай іх дыферэнцыяцыі па катэгорыях і падкатэгорыях. У адпаведнасці з дадзенай класіфікацыяй прапанаваны падыходы да вызначэння бібліятэкамі свайго месца на рынку, яго сегментацыі: публічная бібліятэка -- на аснове дэмаграфічных характарыстык, вучэбная -- акадэмічных, спецыяльная -- на аснове спецыфікі адпаведнай арганізацыі;

-- створана аптымальная мадэль працэсу стратэгічнага планавання ў бібліятэцы, якая грунтуецца на прынцыпе пабудовы "дрэва мэт" і складаецца з этапаў: фарміравання стратэгічных мэт, аналіз асяроддзя бібліятэкі, яе моцных і слабых бакоў дзейнасці, аналіз стратэгічных альтэрнатыў і выбар стратэгіі, рэалізацыя выбранай стратэгіі, размеркаванне рэсурсаў, ацэнка стратэгіі плана;

-- распрацавана методыка прымянення бібліятэчнага маркетынгу з улікам адаптацыі да практыкі работы бібліятэк агульнанавуковага маркетынгу, накіраванага на наступныя аб'екты: на карыстальніка, на стварэнне іміджу бібліятэкі, на змяненне прафесійнага мышлення бібліятэкараў;

-- выяўлены прычыны і асаблівасці прымянення бібліятэкамі Беларусі новай канцэпцыі ўпраўлення -- менеджменту, накіраванага на спецыялізацыю бібліятэк, каардынацыю і кааперацыю іх дзейнасці, развіццё праграмна-мэтавых форм планавання, арганізацыю сістэмы падрыхтоўкі і павышэнне кваліфікацыі кадраў.

Практычнае значэнне атрыманых вынікаў заключаецца ў тым, што вывады і рэкамендацыі, заснаваныя на тэарэтычным абгрунтаванні бібліятэчнага менеджменту, аналізе сучаснага стану ўпраўлення бібліятэкай у Беларусі, могуць выкарыстоўвацца ў практычнай дзейнасці па ўдасканаленню сістэмы ўпраўлення бібліятэкай на макра - і мікраўзроўнях.

Матэрыялы даследавання атрымалі практычнае прымяненне пры падрыхтоўцы метадычных рэкамендацый, тэхналагічных інструкцый і рэгламентуючых дакументаў у рабоце Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (НББ) і іншых бібліятэк рэспублікі. У адпаведнасці з распараджэннем Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь распрацаваны дакументы ( "Тыпавыя правілы карыстання бібліятэкамі ў Рэспубліцы Беларусь", экспертныя ацэнкі прапанаваных на конкурс праектаў праграм ), якія вызначаюць бібліятэчную палітыку ў Беларусі.

Тэарэтычныя вывады, прадстаўленыя ў дысертацыі, выкарыстоўваліся ў вучэбным працэсе пры чытанні спецкурса "Тэарэтычныя і метадычныя асновы бібліятэчнага менеджменту і маркетынгу" ў Беларускім інстытуце праблем культуры (БелІПК) для бібліятэчных работнікаў, а таксама пры правядзенні практыкі магістрантаў Беларускага універсітэта культуры на базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Эканамічная і сацыяльная значнасць працы абумоўлена тым, што ў выніку аналізу упраўленчай дзейнасці бібліятэк ва ўмовах рынку і прагназіравання перспектыўных напрамкаў развіцця бібліятэчнага менеджменту былі распрацаваны практычныя рэкамендацыі і методыкі па яго ўкараненню ў рэспубліцы. Практычныя матэрыялы і распрацоўкі па мадэліраванню эксперыментальных працэсаў тэхналагічнага менеджменту, атрыманыя аўтарам падчас правядзення даследавання на базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, выкарыстоўваюцца ў дзейнасці НББ і іншых бібліятэк рэспублікі, што садзейнічае павышэнню выніковасці работы гэтых устаноў і паскарае выпрацоўку эфектыўных упраўленчых рашэнняў.

Тэарэтычныя палажэнні і вывады дысертацыі істотна паглыбляюць трактоўку прымянення менеджменту ў бібліятэцы, садзейнічаюць вырашэнню шэрага канкрэтных задач бібліятэчнай практыкі, правядзенню новых даследаванняў, стварэнню вучэбных дапаможнікаў.

Матэрыялы дысертацыі могуць выкарыстоўвацца і ў вучэбным працэсе падрыхтоўкі бібліятэкараў, а таксама быць карыснымі для спецыялістаў, якія займаюцца праблемамі менеджменту.

На абарону выносяцца наступныя асноўныя палажэнні.

1. Менеджмент — новая канцэпцыя упраўлення бібліятэкай, механізм яе перабудовы з арганізацыі закрытага тыпу, пасіўнай захавальніцы духоўных каштоўнасцей народа ў арганізацыю, якая арыентуецца на попыт карыстальнікаў праз вывучэнне іх патрэб і фактараў знешняга асяроддзя.

2. Асновай удасканалення існуючай мадэлі бібліятэкі, яе арганізацыі і упраўлення з'яўляюцца прынцыпы і метады менеджменту. Найбольш перспектыўнымі для прымянення ў бібліятэках рэспублікі павінны стаць суадносіны прынцыпаў дэцэнтралізацыі і цэнтралізацыі, каардынацыі і кааперыравання, а таксама прынцып спецыялізацыі бібліятэк.

3. Неабходнай умовай укаранення менеджменту з'яўляецца прымяненне ў бібліятэцы ўдасканаленай структуры стратэгічнага планавання праз увядзенне ў яго ключавых элементаў стратэгічнага менеджменту — умець бачыць і даваць ацэнку, умець рацыянальна выкарыстоўваць наяўныя рэсурсы.



4. Тэарэтычныя асновы менеджменту звязаны з укараненнем маркетынгу накіраванага на наступныя аб'екты: на карыстальніка, на стварэнне іміджу бібліятэкі, на змяненне прафесійнага мышлення бібліятэкараў.

5. Сацыяльна-псіхалагічныя аспекты упраўлення становяцца галоўным, рашаючым фактарам укаранення новых бібліятэчных тэхналогій.

6. Сістэма метадычных распрацовак павінна грунтавацца на спалучэнні тэарэтычных аспектаў менеджменту і спецыфікі дзейнасці бібліятэкі як сацыяльнага інстытута.

Асабісты ўклад суіскальніка. Кандыдацкая дысертацыя з'яўляецца самастойным навуковым даследаваннем, усе вынікі, вынесеныя на абарону, атрыманы выключна дысертантам.

Апрабацыя работы праводзілася на штогадовых навуковых канферэнцыях прафесарска-выкладчыцкага саставу Беларускага універсітэта культуры (1995-1997гг.), у выступленнях аўтара на рэспубліканскай навуковай канферэнцыі "Менеджмент і бібліятэка"(Мінск, 1995г.), семінары Мінскай ЦБС (1995г.) і канферэнцыі "Культуралагічная падрыхтоўка студэнтаў у ВНУ Рэспублікі Беларусь" (Мінск, 1997г.).

Апублікаванасць вынікаў.Па выніках дысертацыйнага даследавання аўтарам апублікавана 6 навуковых работ агульным аб'ёмам каля 3друк.арк.

Структура і аб'ём дысертацыі. Работа уключае уводзіны, агульную характарыстыку работы, дзве главы, заключэнне, спіс выкарыстанай літаратуры, дадаткі. Агульны аб'ём дысертацыі складае 183 старонкі, яна утрымлівае 4 малюнкі. Спіс выкарыстанай літаратуры складаецца з 204 крыніц, з іх 21 на замежных мовах.

У дадаткі уключаны матэрыялы аўтарскіх распрацовак тэхналагічнага менеджменту, "дрэва мэт" бібліятэкі, дакументы для правядзення маркетынгавага даследавання, спіс платных паслуг, матрыца "Акно Джохеры", бізнэс-план бібліятэкі, дзелавая біяграфія, блок-схема тэхналагічнага працэсу ў аўтаматызаваным рэжыме, працоўнае пагадненне на выкананне работы па творчаму заказу, план вучэбнага спецкурса.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Першая глава "Бібліятэчны менеджмент як частка менеджменту сацыяльна-культурнай сферы" складаецца з чатырох раздзелаў. Першы прысвечаны разгляду асаблівасцей менеджменту бібліятэчнай справы як арганічнай часткі сацыяльна-культурнай сферы. У ім раскрываюцца асаблівасці менеджменту некамерцыйных арганізацый, да якіх адносіцца і бібліятэка як сацыяльны інстытут, заклікаthe забяспечваць эфектыўнае бібліятэчна-

інфармацыйнае абслугоўванне. Вывучэнне пытанняў бібліятэчнага менеджменту, у першую чаргу самога паняцця "менеджмент", паказала, што гэты тэрмін агульны для ўсіх краін свету, з'яўляецца аналагам тэрміна "упраўленне" у больш вузкім яго значэнні і прымяняецца толькі да ўпраўлення сацыяльна-эканамічнымі працэсамі на ўзроўні арганізацыі, дзеючай у рыначных умовах.

Для вызначэння асаблівасцей менеджменту сацыяльна-культурнай сферы разглядаецца гісторыя яго ўзнікнення і робяцца высновы, што на сучасным этапе развіцця культуры неабходна паскорыць рост яе рэсурснага патэнцыялу, змяніць структуру і сфарміраваць новы механізм выкарыстання рэсурсаў. Многія асаблівасці ўпраўлення сацыяльна-культурнай сферай у той або іншай ступені ўласцівы і ўпраўленню бібліятэчнай справай. Гэта дазволіла нам даць вызначэнне бібліятэчнага менеджменту як дзейнасці па планаванню, арганізацыі працоўных і матэрыяльных рэсурсаў для эфектыўнага выканання сацыяльных функцый і дасягнення мэт бібліятэкі.

У адпаведнасці з палажэннямі менеджменту дадзена характарыстыка бібліятэкі як некамерцыйнай арганізацыі. Аб'ём і змест дзейнасці бібліятэкі зыходзяць з яе сутнасных характарыстык як часткі культурнай сферы, якая з сацыяльна-інфармацыйнага пункту гледжання з'яўляецца сістэмай забеспячэння доступу да дакументаў, інфармацыі, ведаў. Сацыяльна-інфармацыйны аспект дзейнасці бібліятэкі дапаўняецца сацыяльна-эканамічным, што дазваляе ўбачыць сістэму бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання як сістэму са зваротнай сувяззю, якая падуладна закону менеджменту — адпавядаць патрабаванням грамадства, задавальняць яго патрэбы у бібліятэчным абслугоўванні у поўным аб'ёме. Вызначэнне цэласнасці сістэмы бібліятэчнага абслугоўвання падмацоўваецца ўвядзеннем і раскрыццём паняцця "знешняе асяроддзе". Даследаванне паказала, што бібліятэка ва ўмовах эканамічнай перабудовы не павінна заставацца арганізацыяй закрытага тыпу, пасіўнай захавальніцай памяці чалавецтва, якая занята вырашэннем толькі унутраных праблем.

Стварэнне інфармацыйнай сістэмы для вывучэння унутрыбібліятэчнай сітуацыі і фактараў знешняга асяроддзя ўваходзіць у функцыі маркетынгавага менеджменту, які вызначаецца намі як працэс прывядзення у адпаведнасць рэсурсаў і магчымасцей бібліятэкі з патрабаваннямі і [illegible] карыстальнікаў.

Неабходнасць адаптацыі да знешняга асяроддзя і вырашэнне [illegible] з гэтым складаных аспектаў арганізацыйнай [illegible] ставіць [illegible] бібліятэ-



такай шэраг праблем, вырашэнне якіх патрабуе адпаведнай сістэмы упраўлення. Існуючая мадэль бібліятэкі не адпавядае патрабаванням часу. Мэтазгодна прымяненне сістэмы упраўлення бібліятэкай у кантэксце раздзялення улады на тры ўзроўні: вышэйшы (дырэкцыя бібліятэкі), сярэдні (загадчыкі аддзелаў, філіялаў), асноўны — аперацыйны менеджмент (кіраўнікі груп, сектараў, галоўныя спецыялісты). Такі падыход дае магчымасць дакладна вызначыць састаў функцый, правоў і абавязкаў на кожным узроўні упраўлення.

Найбольш эфектыўным напрамкам удасканалення арганізацыйнай сістэмы упраўлення бібліятэкай з'яўляецца прымяненне адаптыўных структур — гэта праектна-матрычная, інавацыйная структура і кангламерат. Іх увядзенне дапаможа бібліятэцы вырашыць складаныя праблемы упраўлення пры сутыкненні з хуткімі зменамі у знешнім асяроддзі або прымяненні новых аўтаматызаваных тэхналогій.

Вывучэнне і акумуліраванне айчынных і замежных тэорый дазволіла распрацаваць класіфікацыю прынцыпаў бібліятэчнага менеджменту, якія падзяляюцца на тры групы: структурна-функцыянальныя, прынцыпы упраўлення людзьмі і прынцыпы, фарміруючыя асобу менеджара, а таксама комплексу метадаў упраўлення: даследчыя, арганізацыйна-распарадчыя, сацыяльна-псіхалагічныя. Прапанаваная іх класіфікацыя і спосабы рэалізацыі выявілі найбольш перспектыўныя для прымянення у бібліятэках сувадносіны прынцыпаў дэцэнтралізацыі і цэнтралізацыі, каардынацыі і кааперыравання, а таксама прынцып спецыялізацыі. Канцэпцыя цэласнасці сістэмы бібліятэчнага менеджменту падмацоўваецца увядзеннем і раскрыццём сутнасных характарыстык яго функцый, якія утвараюць функцыянальную структуру упраўлення і у прымяненні да бібліятэкі разглядаюцца як асноўныя накірункі яе упраўленчай дзейнасці.

Найбольш значным з іх з'яўляецца стратэгічнае планаванне, якое прадугледжвае падрыхтоўку, разгляд і рэалізацыю пытання аб тым, як бібліятэцы дасягнуць пастаўленых мэт. Спецыфіка укаранення стратэгічнага планавання патрабуе паслядоўнасці этапаў СП, кожны кампанент якога разглядаецца як узаемазвязаны элемент працэсу. На падставе існуючых тэорый менеджменту створана аптымальная мадэль працэсу стратэгічнага планавання у бібліятэцы, якая заснавана на прынцыпе пабудовы "дрэва мэт" і выглядае наступным чынам.




Мал. I. Працэс стратэгічнага планавання.

Важным механізмам рэалізацыі стратэгічнага плана з'яўляецца арганізацыйная работа, здольная забяспечыць здзяйсненне пастаўленых мэт. Праведзенае даследаванне дае падставу зрабіць выснову, што ўсе абазначаныя функцыі ўпраўлення: планаванне, арганізацыя, матывацыя,кантроль— цесна ўзаемазвязаны, без уліку і правядзення адной з іх працэс упраўлення будзе даваць збой. Паслядоўнасць рэалізацыі функцый прадстаўлена ў выглядзе схемы.




Мал. 2. Узаемасувязь функцый упраўлення.

Новая сістэма ўпраўлення бібліятэкай рэалізуецца і праз новую функцыю менеджменту — маркетынг, выкарыстанне канцэпцыі і метадаў якога аказала істотны ўплыў на бібліятэчную справу, замацавала ў дзейнасці бібліятэк прыярытэт патрэб карыстальнікаў.




Мал. 3. Класіфікацыя відаў маркетынгу.

Бібліятэчны маркетынг — комплекс мерапрыемстваў у галіне даследавання дзейнасці бібліятэкі па паляпшэнню ўсіх фактараў, якія уплываюць на працэс вытворчасці і прадастаўленне тавараў і паслуг карыстальнікам.



Маркетынг дапамагае выявіць рацыянальныя шляхі камунікацыі паміж бібліятэкай і яе карыстальнікамі. Бібліятэка як сацыяльны інстытут, можа паспяхова развівацца толькі тады, калі грамадства мае ў ім патрэбу, калі ўспрымае яго як вышэйшы важны інстытут, без якога яно не будзе паўнацэнным, дэмакратычным. Сучасны маркетынг надае асаблівую важнасць кадравым пытанням. Укараненне рынкачных адносін у бібліятэчнае абслугоўванне, прымяненне канцэпцыі маркетынгу, патрабуюць змянення прафесійнага мышлення бібліятэкараў, ведання імі асноўных бакоў дзейнасці бібліятэкі: стыль работы, культура, дзелавыя кантакты.

Непасрэдна з тэарэтычнымі пытаннямі бібліятэчнага менеджменту звязаны яго сацыяльна-псіхалагічныя аспекты, якія вызначаюць поспех дзейнасці калектыву пры дасягненні мэт бібліятэкі. Па гэтаму пытанню выяўлены аб'ектыўныя цяжкасці ўпраўлення ўзаемаадносінамі людзей, якія залежаць ад многіх сацыяльна-псіхалагічных фактараў і перш за ўсё ад асобы кожнага індывіда, яго адносін да работы, калег, асяроддзя і г. д.

Прымяненне новага механізма ўпраўлення патрабуе іншага погляду на чалавечы фактар.Істотна змянілася матывацыя ўпраўлення персаналам -- пераважнае значэнне набылі сацыяльна-псіхалагічныя метады упраўлення над адміністрацыйнымі.Падыходы да вырашэння складаных сацыяльна-псіхалагічных сітуацый патрабуе ад кіраўніка, які ўпраўляе персаналам бібліятэкі, прафесійна-асабістых якасцей, умення, ведання асноў псіхалогіі і педагогікі. На аснове тэарэтычных і практычных распрацовак прапанаваны магчымыя варыянты выхаду са складаных канфліктных сітуацый і вызначаны фактары, якія ўплываюць на задаволенасць людзей сваёй працай.

Тэарэтычныя палажэнні з'яўляюцца базай для распрацаваных у другой главе методык менеджменту, эфектыўнае укараненне якіх у работу бібліятэк абумовіла іх дыферэнцыяцыю. Працэс вызначэння свайго месца на рынку, яго сегментацыя праводзяцца ў адпаведнасці з прапанаванай класіфікацыяй бібліятэк, спецыялізацыяй іх дзейнасці.Публічная бібліятэка здзяйсняе сегментацыю на аснове дэмаграфічных характарыстык; вучэбная— на аснове акадэмічных (спецыяльнасць, адукацыя, веды); спецыяльная бібліятэка павінна улічваць структуру сваёй арганізацыі, яе статус і размеркаванне адказнасці паміж усімі яе супрацоўнікамі.

Сучасным метадам дасягнення найбольш эфектыўнай дзейнасці бібліятэкі з'яўляецца стратэгічнае планаванне, якое здзяйсняецца зыходзячы з вызначэння галоўных мэт і устанаўлення рацыянальных шляхоў выкарыстання наяўных рэсурсаў для іх дасягнення.Прапанаваная методыка стратэгічнага планавання рэалізуецца пры ўмове наяўнасці рэлевантнай і адэкватнай інфармацыі, якая дае уяўленне аб перспектывах бібліятэкі і сканцэнтравана на аспектах знешняга асяроддзя.




Мал. 1. Фактары знешняга асяроддзя.

На сучасным этапе ўзрастае значэнне эканамічных метадаў упраўлення, якія грунтуюцца на прымяненні сістэмы маркетынгу -- рыначнай канцэпцыі ўпраўлення. У кантэксце праблем упраўлення бібліятэкай распрацавана методыка рэалізацыі маркетынгу з улікам яго адаптацыі да практыкі работы бібліятэк праз сістэму сацыяльна-эканамічных фактараў. Перабудова сістэмы ўпраўлення бібліятэкай звязана з укараненнем маркетынгу, накіраванага на наступныя аб'екты: на карыстальніка, на стварэнне іміджу бібліятэкі, на змяненне прафесійнага мышлення бібліятэкараў. У распрацаванай методыцы ўкаранення маркетынгу прапанавана ўлічваць наступныя канцэптуальныя палажэнні: уключыць рынак паслуг у сістэму эканамічных рэгулятараў; перайсці ад нарошчвання аб'ёмаў паслуг і прадукцыі да прапановы таго, што сапраўды патрэбна; мець дастаткова поўную інфармацыю аб рынку, на падставе якой вызначыць мэты і прыярытэты бібліятэкі; ведаць патрэбы мэтавых груп.

Аналіз упраўленчай дзейнасці бібліятэк Беларусі сведчыць, што менеджмент садзейнічае адаптацыі іх да прынцыпова іншых умоў гаспадарання. Сярод фактараў, якія ўплываюць на ўкараненне менеджменту ў работу бібліятэк, можна вылучыць:

— працэс суверэнізацыі Рэспублікі Беларусь, асабліва значны для развіцця нацыянальнай бібліятэчнай сістэмы як суб'екта ўпраўленчай дзейнасці;

-- змяненне эканамічнай сітуацыі, пераход да рыначных адносін, што запатрабавала новых падыходаў да ўпраўлення бібліятэкай;

-- некаторыя характарыстыкі аўдыторыі чытачоў(брокер,фермер,бізнесмен і інш.), звязаныя са змяненнямі сацыяльна-эканамічнай сітуацыі і, як вынік, перабудова дзейнасці бібліятэкі;

-- узнікненне новых і пашырэнне сферы функцыяніравання ўжо існуючых каналаў распаўсюджвання новых тэхналогій у бібліятэках для паспяховай канкурэнцыі на рынку інфармацыі.

Даследаванне паказала, што менеджмент яшчэ не стаў увогуле нормай для бібліятэк рэспублікі. У іх структуры адсутнічае падраздзяленне, якое атрымлівала б звесткі з усіх аддзелаў, валодала унутранай і знеш-



няй інфармацыяй і, арыентуючыся на канчатковыя мэты бібліятэкі, рыхтавала праекты ўпраўленчых рашэнняў для яе кіраўніцтва. Вядома, у перспектыве такія формы арганізацыі бібліятэкі, якія будуць адпавядаць сацыяльным, нацыянальным і культурным асаблівасцям, павінны з'явіцца.

Праведзеная даследчая работа дзейнасці бібліятэкі як сацыяльнага інстытута ў новых сацыяльна-эканамічных умовах,высвятленне прычын і асаблівасцей прымянення імі новай канцэпцыі ўпраўлення -- менеджменту дало магчымасць зрабіць адпаведныя вывады.

1. Праблемы бібліятэк, цесна звязаныя з агульнакультурнымі і сацыяльна-эканамічнымі працэсамі, што адбываюцца ў грамадстве, запатрабавалі перагляду сэнсу і мэт дзейнасці. Бібліятэка не павінна заставацца арганізацыяй закрытага тыпу, пасіўнай захавальніцай памяці чалавецтва, якая занята вырашэннем сваіх унутраных праблем. Для карыстальнікаў унутраныя праблемы бібліятэкі маюць значэнне толькі тады, калі яны закранаюць іх інтарэсы. Таму прыярытэтнай з'яўляецца стратэгія, якая ставіць перш за ўсё сацыяльныя арыенціры, што ўлічваюць патрэбы карыстальнікаў, павышаюць запатрабаванасць бібліятэкі і, як вынік, умацоўваюць яе аўтарытэт у грамадстве.

Садзейнічае вырашэнню найбольш складаных аспектаў арганізацыйнай работы бібліятэк новая канцэпцыя ўпраўлення -- менеджмент.

2. Існуючая мадэль бібліятэкі, заснаваная на іерархічнай сістэме ўпраўлення, не адпавядае патрабаванням часу. Неабходна істотна змяніць структуру бібліятэкі, перайсці ад бюракратычнай сістэмы ўпраўлення, дзе бібліятэка разглядаецца як набор механічных, больш або менш аўтаномных частак, заснаваных на адміністрацыйнай іерархіі і лінейна-функцыянальным узаемадзеянні падраздзяленняў, да арганізацыі, што базіруецца на перапрацоўцы інфармацыі, здольнай забяспечыць узаемадзеянне спецыялістаў розных галін ведаў.

3. Для ўдасканалення арганізацыі і ўпраўлення бібліятэкай неабходна прымяненне метадаў менеджменту, якія цесна звязаны з прынцыпамі ўпраўлення і выступаюць у якасці спосабаў іх рэалізацыі. Важным механізмам адаптацыі бібліятэкі да новай сітуацыі ў знешнім асяроддзі з'яўляюцца суадносіны прынцыпаў дэцэнтралізацыі і цэнтралізацыі бібліятэчнага абслугоўвання, каардынацыі і каапераравання дзейнасці бібліятэк, а такасама пытанні спецыялізацыі бібліятэк. Гэтыя механізмы садзейнічаюць удасканаленню ўпраўлення бібліятэкай, яе развіццю.

Майстэрства упраўлення заключаецца ў правільным выбары спалучэння метадаў упаўлення, што дазваляе дасягнуць сваіх мэт пры мінімальных затратах і максімальнай эфектыўнасці.

4. Неабходнасць укаранення ў практыку работы бібліятэк стратэгічнага планавання зыходзіць з ключавых элементаў стратэгічнага менеджменту:

— умець бачыць і даваць ацэнку;

-- умець рацыянальна выкарыстоўваць наяўныя рэсурсы.

Працэс стратэгічнага планавання уключае не толькі фарміраванне мэт бібліятэкі, але і стратэгію яе развіцця на блізкую і далёкую перспектывы. Стратэгія прадугледжвае распрацоўку абгрунтаваных захадаў і планаў дасягнення вызначаных мэт з улікам магчымасцей бібліятэкі, пры гэтым яна павінна адпавядаць назапашанаму патэнцыялу бібліятэкі і рацыянальна выкарыстоўваць наяўныя рэсурсы. Важным механізмам увязкі стратэгіі з'яўляецца распрацоўка планаў і арыенціраў: тактыкі, палітыкі, працэдур і правілаў.

Праверка стратэгічнага плана адбываецца пры яго ацэнцы, якая праводзіцца шляхам параўнання вынікаў работы з мэтамі.

5. У кантэксце праблем упраўлення бібліятэкай прымяненне канцэпцыі маркетынгу павінна быць накіравана на:

— карыстальніка;

— стварэнне іміджу бібліятэкі;

— змяненне прафесійнага мыслення бібліятэкараў.

Пры пераходзе да новых эканамічных адносін, абумоўленых законамі рынку, неабходна арыентавацца на эканамічныя метады і маркетынгавую канцэпцыю упраўлення.

Выкарыстанне канцэпцыі і метадаў маркетынгу замацоўвае ў дзейнасці бібліятэкі прыярытэт патрэб карыстальнікаў і падначаленасць ім бібліятэчных рэсурсаў. Маркетынг дапамагае выявіць рацыянальныя шляхі камунікацыі паміж бібліятэкай і яе карыстальнікамі. Залог будучыні любой бібліятэкі — арыентацыя яе на карыстальніка, яго запатрабаванні і іх вывучэнне.

Для фарміравання станоўчага іміджу бібліятэкі ў грамадстве неабходна ведаць сваіх карыстальнікаў, іх спадзяванні ў адносінах да яе, што павінна зрабіць бібліятэка, каб задаволіць патрабаванні грамадства.



Укараненне рыначных адносін у бібліятэчнае абслугоўванне, прымяненне маркетынгу патрабуюць змянення прафесійнага мыслення бібліятэкараў, ведання імі асноўных бакоў дзейнасці бібліятэкі: мэты, стыль работы, культура, дзелавыя кантакты. Такая падрыхтоўка бібліятэчнага персаналу немагчыма без павышэння кваліфікацыі і бесперапыннай адукацыі кадраў.

6. Новыя тэхналогіі, прымяненне новага механізма упраўлення патрабуюць іншага погляду на чалавечы фактар. На першы план выступаюць сацыяльна-псіхалагічныя і педагагічныя аспекты упраўлення, якія ў сучасных умовах набылі пераважнае значэнне над адміністрацыйнымі метадамі упраўлення. Работа бібліятэкі павінна быць пастаўлена так, каб людзі атрымлівалі ад яе максімум задавальнення і мелі максімум адказнасці.

7. Новая канцэпцыя упраўлення, новыя погляды на месца бібліятэкі ў дэмакратычным грамадстве абумовілі неабходнасць распрацовак, якія практычна увасабляюць сучасны менеджмент і дапамагаюць пераадолець старыя арганізацыйныя і упраўленчыя парадыгмы. Практычнае прымяненне менеджменту ў бібліятэчнай справе патрабуе яго адаптацыі праз сістэму метадычных распрацовак, што абумоўлена спецыфікай дзейнасці бібліятэкі як сацыяльнага інстытута. Методыкі менеджменту, заснаваныя на спалучэнні яго тэарэтычных асноў і спецыфікі дзейнасці бібліятэкі, садзейнічаюць вырашэнню найбольш складаных аспектаў упраўлення і адначасова прагназіруюць перспектыўныя напрамкі развіцця бібліятэчнай справы. Вопыт паэтапнай апрабацыі уключаных у дысертацыю аўтарскіх распрацовак у галіне менеджменту пацвердзіў правільнасць тэарэтычных высноў і практычную значнасць метадычных матэрыялаў аўтара.

## Спіс публікацый па тэме дысертацыі


1. Менеджмент в Национальной библиотеке Белоруссии//Библиотековедение. - 1995. - №6. - С. 25-29.

2. Маркетынг у публічнай бібліятэцы//Бібліятэчны свет. - 1997. - №3. - С. 3 - 5.

3. Некаторыя аспекты менеджменту бібліятэчнай справы//Бібліятэчны свет. - 1997. - №4. - С. 5-8.

4. Методыка нарміравання бібліятэчных працэсаў у аўтаматызаваным рэжыме//Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва. - 1995. - Вып.3. - С. 51 -66.

5. Праблемы бібліятэчнай стандартызацыі//Веснік Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі. - 1995. - №2. - С. I3-I6.

6. Сацыяльна-псіхалагічныя аспекты бібліятэчнага менеджменту//Культура Беларусі: спадчына і сучаснасць: Тэз. дакл. на навук. канф. ( I8-I9 красавіка, 1996 г.)/Беларускі універсітэт культуры. - Мн., 1997. - С. 73 - 75.



## РЭЗЮМЕ

Ракавецкая Людміла Іванаўна

"Тэарэтыка-метадычныя асновы бібліятэчнага менеджменту"

Ключавыя словы: бібліятэчны менеджмент, функцыі ўпраўлення, прынцыпы і метады менеджменту, сацыяльна-псіхалагічныя аспекты ўпраўлення, матывацыя працы, патрэба, стратэгічнае планаванне, бібліятэчны маркетынг, маркетынгавы менеджмент.

Аб'ектам даследавання з'яўляецца бібліятэчны менеджмент.

Мэта работы: распрацоўка і абгрунтаванне тэарэтычнай асновы канцэпцыі бібліятэчнага менеджменту, выяўленне заканамернасцей яго развіцця.

Асноўныя метады даследавання: сістэмны аналіз, тэарэтычнае мадэліраванне, прагназіраванне, кантэнт-аналіз.

Навуковая навізна і тэарэтычная значнасць: упершыню тэарэтычна абгрунтавана трохузроўневая сістэма ўпраўлення бібліятэкай: вышэйшы ўзровень (дырэкцыя бібліятэкі), сярэдні (загадчыкі аддзелаў, філіялаў), асноўны -- аперацыйны менеджмент (кіраўнікі груп, сектараў, галоўныя спецыялісты); прапанавана навуковае вызначэнне тэрмінаў "бібліятэчны менеджмент","бібліятэчны маркетынг","маркетынгавы менеджмент, абгрунтаваны іх аб'ём і змест; дадзена класіфікацыя прынцыпаў і метадаў бібліятэчнага менеджменту; сфарміравана функцыянальная структура ўпраўлення бібліятэкай у новых умовах; даследаваны ўплыў сацыяльна-псіхалагічных аспектаў на ўпраўленне бібліятэкай; навукова распрацаваны падыходы да рэалізацыі канцэпцыі бібліятэчнага маркетынгу; абгрунтавана класіфікацыя бібліятэк, заснаваная на асабістых і грамадска значных матывацыях звароту чытача у бібліятэку; створана аптымальная мадэль працэсу стратэгічнага планавання ў бібліятэцы, якая грунтуецца на прынцыпе пабудовы "дрэва мэт"; распрацавана методыка прымянення бібліятэчнага маркетынгу з улікам адаптацыі традыцыйнага маркетынгу да практыкі работы бібліятэк праз сістэму сацыяльна-эканамічных фактараў; выяўлены прычыны і асаблівасці прымянення бібліятэкамі Беларусі новай канцэпцыі ўпраўлення — менеджменту.

Атрыманыя ў выніку дысертацыйнага даследавання матэрыялы могуць быць выкарыстаны пры фарміраванні мадэлі ўпраўлення бібліятэкай у Рэспубліцы Беларусь, на іх аснове могуць быць падрыхтаваны вучэбныя дапаможнікі. Атрыманыя тэарэтычныя веды склалі аснову спецкурса "Тэарэтычныя і метадычныя асновы бібліятэчнага менеджменту і маркетынгу", які выкладаецца у БелІПК.

## РЕЗЮМЕ

Ракавецкая Людмила Ивановна

"Теоретико-методические основы библиотечного менеджмента"

Ключевые слова: библиотечный менеджмент, функции управления, принципы и методы менеджмента, социально-психологические аспекты управления, мотивация труда, потребность, стратегическое планирование, библиотечный маркетинг, маркетинговый менеджмент.

Объектом исследования является библиотечный менеджмент.

Цель работы: разработка и обоснование теоретической основы концепции библиотечного менеджмента, выявление закономерностей его развития.

Основные методы исследования: системный анализ, теоретическое моделирование, прогнозирование, контент-анализ.

Научная новизна и теоретическая значимость: впервые теоретически обоснована трехуровневая система управления библиотекой: высший уровень (дирекция библиотеки), средний (заведующие отделов и филиалов), основной -- операционный менеджмент (руководители груп, секторов, главные специалисты); предложено научное определение терминов "библиотечный менеджмент", "библиотечный маркетинг", "маркетинговый менеджмент", обоснован их объем и содержание; дана классификация принципов и методов библиотечного менеджмента; сформирована функциональная структура управления библиотекой в новых условиях; исследовано влияние социально-психологических аспектов на управление библиотекой; научно разработаны подходы к реализации концепции библиотечного маркетинга; обоснована классификация библиотек, основанная на личностных и общественно значимых мотивациях обращения читателей в библиотеку; создана оптимальная модель процесса стратегического планирования в библиотеке, которая базируется на принципе постройки "древа целей"; разработана методика применения библиотечного маркетинга с учётом адаптации традиционного маркетинга к практике работы библиотек через систему социально-экономических факторов; выявлены причины и особенности применения библиотеками Беларуси новой концепции управления -- менеджмента.

Полученные в результате диссертационного исследования материалы могут быть использованы при формировании модели управления библиотекой в Республике Беларусь, на их основе могут быть подготовлены учебные пособия. Полученные теоретические знания составили основу спецкурса "Теоретические и методические основы библиотечного менеджмента и маркетинга", читаемого в БелИПК.





## RESUME

"Theoretical and Methodical Basis of Library Management".

by Lioudmila I.Rakavetskaia

"Koy"words: Library Management, Management Functions, Management Principles and Methods, Social and Psychological Aspekts of Management, Work Motivation, Needs, Strategic Planning, Library Marketing, Marketing Management.

The object of receach of the present thesis is Library Management.

The work's aim is to develop and substantiate the theoretical basis of Library Management conception, to make clear regularities of its development.

The main methods of research are system analysis, theoretical simulation, forecasting, content-analysis.

The scientific novelty and tyeoretical significance are: for the first time the three level system of Library Management is substantiated: first level(Director's office), intermediate level(managers of departments and branches), basie level -- operation management(leaders of groups and sectors, head specialists); scientific definitions of "Library Management", "Library Marketing","Marketing Management" are proposed and their scope and content are grounded;the classification of principles and methods of Lidrary Management is given; function structure of Library Management under new conditions is formulated;influence of social and psychological aspects of Library Management is analysed; conception of library management is developed scientifically; classification of libraries, based on personal and social motives of reader's choice of library is grounded; the optimum model of library strategic planning based on the principle of "chelevance tree" was worked out; the methodology of usage of library marketing cousidering problems, arising foom adaptation of traditional marketing to libraries' practices using the system of social and ecanomic factors; the reasons and specialties of using the new conception of management in jibraries of Belarus.

The results of the research work can be employed for the development of the model of management for libraries in Belarus. Eduсational manuals may be prepared on their basis. The special course of lectures given of the BelIIS "Theoretical and methodological basis of library management and marketing" is mainly based on the researching performed.

АЎТАРЭФЕРАТ

дысертацыі на суісканне навуковай ступені
кандыдата педагагічных навук

ТЭАРЭТЫКА - МЕТАДЫЧНЫЯ АСНОВЫ БІБЛІЯТЭЧНАГА
МЕНЕДЖМЕНТУ

Падп.да друку 20.II.97.Фармат 60х84 I/I6.Папера
друк.Ум.друк.арк.I,22.Ул.-выд.арк.I,0I.Зак.3I2.Тыр.80 экз.

Ратапрынт Беларускага універсітэта культуры.
22000I,Мінск,Рабкораўская,I7.